ком фундаменте национальной культуры возможно построить прочное культурное общество.

*Список литературы*


1. Биржаков, М.Б. Введение в туризм / М.Б. Биржаков. – М.: Дом «Герда», 2004.
2. Садохин, А.П. Теория и практика межкультурной коммуникации: учебное пособие для студентов вузов / А.П. Садохин. – М., 2004.
3. Гусев, Н. Туризму быть / Н. Гусев // Народная газета. – 2009. – 8 июля.
4. Туризм в Беларуси / Л.М. Гайдукевич [и др.]. – Минск: БГУ, 2001.
5. Швед, В.В. По следам гродненской старины / В.В. Швед. – Гродно, 1993.
6. Татаринов, Ю.А. Белорусская старина / Ю.А. Татаринов. – Минск, 2005.


*The role, essence and place of cultural-cognitive (informative) tourism is shown in the article. The basic directions in studying the cultural heritage of our native land, in civilization and patriotism formation are analyzed.*

***А.А. Зноско**, преподаватель гуманитарного колледжа ГрГУ им. Я. Купалы (г. Гродно).*

УДК 394.2 (476) – 057.875

**В.Л. Гуцько**

# СПЕЦЫФІКА ЎВАСАБЛЕННЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА АБРАДУ Ў СТУДЭНЦКАЙ ГРУПЕ

*Рассматривается методика организации белорусского народного обряда в закрытом помещении в условиях подготовки к экзамену по дисциплине «Режиссура праздников». Этапы организации обряда содержат застольный период (выбор обряда, написание сценария, чтение по ролям), репетиции по эпизодам (мизансцена), генеральный прогон. Выделены определенные категории студентов по принципу участия в общем деле (добровольцы, теоретики, критики, самодостаточные, пассив, организаторы). Даются методические рекомендации для улучшения качества психолого-педагогических отношений в коллективе.*

Развіццё творчасці ў студэнтаў гуманітарных ВНУ – неабходная ўмова навучання. Агульныя творчыя пошукі студэнтаў і выкладчыкаў, праблемнае навучанне ў адукацыйным працэсе садзейнічаюць развіццю крэатыўнага мыслення і падрыхтоўцы спецыялістаў у сферы культуры да прыняцця нетрывіяльных рашэнняў у нестандартных, складаных умовах. Студэнцкая творчасць – спосаб і працэс атрымання вынікаў навучання па разнастайных дысцыплінах. Творчыя памкненні студэнтаў заўсёды залежаць ад якасцей характару іх асобы, зацікаўленасці тэмай і імкнення да поспеху. Вялікая роля ў станаўленні творчых пошукаў студэнтаў надаецца выкладчыку, які іх накіроўвае для вырашэння вучэбных задач па спецыяльных і агульнаадукацыйных дысцыплінах.

Студэнты кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» разам з выкладчыкам па дысцыпліне «Рэжысура свят (традыцыйнага абраду)» арганізоўваюць і праводзяць абрад у закрытым памяшканні як выніковы кантроль па прадмету на другім курсе III семестра. Падтрымка і заха-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ванне традыцыйнай спадчыны беларусаў, заснаванай на захаванні нематэрыяльнай культуры, – адзін з прыярытэтных кірункаў работы кафедры. Правядзенне абрада звязана з замацаваннем ведаў па спектру спецыяльных дысцыплін – «Традыцыйная святочная культура беларусаў», «Музычна-шумавое вырашэнне свята», «Моўнае дзеянне ў свяце», «Мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята», «Пластыка-харэаграфічнае вырашэнне свята», «Асновы рэжысуры і майстэрства акцёра», «Міфалогія беларусаў», «Гісторыя свят» і інш. Таму паказ абраду – вынік работы педагогаў, сінтэз творчай работы студэнтаў і паказу педагагічных і рэжысёрскіх здольнасцей выкладчыкаў, якія прымалі ўдзел у выхаванні моладзі па розных відах мастацтва.

Студэнты прапаноўваюць па асабістаму выбару тэмы сямейна-бытавых ці каляндарных абрадаў. Сярод сямейна-бытавых абрадаў разглядаюцца вяселле, радзіны, уваходзіны, провады ў салдаты. Накірункі захапленняў студэнтаў у дачыненні да каляндарных абрадаў пашыраны разнастайна: ад самых распаўсюджаных, такіх як Каляды, Масленіца, Купалле, да малавядомых, рэдкіх – Гуканне вясны, Пахаванне стралы, Жаніцьба коміна. Даследаванне абрада адбываецца ў непасрэдным знаёмстве моладзі з носьбітамі фальклорнай традыцыі, аналізе навуковай і навукова-метадычнай літаратуры па вызначанай тэматыцы. Асабліва актыўна ўдзельнічаюць у выбары агульнага абраду тыя студэнты, хто сапраўды цікавіцца бытаваннем фальклорнай абрадава-песеннай спадчыны на вёсках. Праяўляе цікавасць да арганізацыі абрадаў і моладзь, якой неабыякавы лёс захавання нацыянальных каштоўнасцей нематэрыяльнай культуры – традыцый, мовы, песень.

Студэнты аналізуюць змест і сімволіку разнастайных абрадаў і тым самым заахвочваюць равеснікаў да звароту ўвагі да выбранага імі абраду. Метадам большасці галасоў студэнты згаджаюцца да ўвасаблення пэўнага абраду. Адбываецца падрабязны разгляд абрадавых дзеянняў і падзел іх на эпізоды з дакладным вызначэннем падзейнага шэрагу – экспазіцыі, завязкі, развіцця дзеяння, кульмінацыі і фінала. Кожнай падгрупе студэнтаў прапануецца прааналізаць выбраную імі частку абрада, раскрыць сімволіку рытуалаў, якія ўваходзяць у іх склад, напісаць літаратурны сцэнарый эпізода. Педагог ажыццяўляе кантроль за якасцю работы студэнтаў, дапамагае ў складаных сітуацыях, прапаноўвае новыя шляхі ў вырашэнні спрэчак.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць у літаратурным сцэнарыі на спосабы актывізацыі людзей, якія прыйшлі паглядзець на абрад. Мэта сцэнарыя – зрабіць гледача ўдзельнікам абраду, дапасаваць яго да абараду праз веру ў прапанаваныя абставіны. Вядома, што прымаць актыўны ўдзел у абрадзе гледачы змогуць толькі праз некаторы час пасля пачатку прадстаўлення, калі прыгледзяцца да дзеяння, якое будзе адбывацца вакол. Таму пажадана, каб гледачы назіралі за ім спачатку. Е. Гратоўскі – заснавальнік абрадавага тэатра – падкрэсліваў неабходнасць назірання збоку за абрадавым дзеяннем: «Аддаліць гледача – значыць даць яму шанец саўдзельнічаць у дзеянні» [1, с. 105]. Толькі падчас развіцця кульмінацыйных падзей у сведкаў можа з’явіцца магчымасць далучыцца да агульных рытуалаў, напрыклад, частавання караваем і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наступны этап работы з абрадам – застольны перыяд ці чытанне сцэнарыя з усёй групай студэнтаў. Мэта чытання – вызначэнне канфлікта ў эпізодах, звышзадачы кожнага персанажа і яго скразнога дзеяння, якое дапамагае аб’яднаць лінію ролі герояў. Падчас чытання студэнты не толькі вучаць тэкст сцэнарыя напамяць, але вучацца валодаць асновай імправізацыі, дабаўляюць рэплікі на выклікі вядучых персанажаў, моўныя рэакцыі на згоду ці адмову дзеяння і магчымыя адказы на варыятыўныя прамовы гледачоў. Падчас чытання закладваецца тэмпа-рытм дзеяння, які павінен падтрымлівацца выкладчыкам. Паралельна з такім важным этапам работы праводзіцца вывучэнне песень па нотных запісах ці аўдыязапісах. Менавіта аўдыязапісы дапамагаюць студэнтам вывучыць і замацаваць спеўную манеру і дыялектычные вымаўленне.

Трэці этап увасаблення абраду – яго мізансцэнаванне. Галоўная задача мізансцэн у абрадзе, каб яны выяўлялі сімвалічныя тлумачэнні абраду, раскрывалі карціну свету, якая пануе ў свядомасці персанажаў абраду. Вельмі важна вызначыць цэнтр мізансцэнічных рухаў, каб ён дапамагаў, а не перашкаджаў сэнсаваму разуменню дзеяння. Да прыкладу, адным з важных цэнтраў мізансцэнічных дзей у вясельным абрадзе выступае стол, які з’яўляецца цэнтральным падчас выкупу маладой. У эпізодзе сустрэчы маладых бацькамі цэнтрам становяцца брама і парог хаты. У эпізодах застолля мізансцэнічным цэнтрам выступае месца за сталом, дзе сядзяць маладыя. Такім чынам, у эпізодзе цыганоў месца маладых займаюць падстаўныя, якія ўспрымаюцца ўсімі як камічны прататып маладых.

Самае складанае ў рэпетыцыях абрада – дасягнуць сапраўднага перажывання ў рабоце над ролямі, стварыць атмасферу веры ў абрадавыя дзеянні, якія праводзяць персанажы. Шмат увагі надаецца працы студэнтаў над асабістай імправізацыяй і імправізацыяй у агульнай канве дзеяння, бо бытаванне фальклорнай традыцыі не можа існаваць у кансерватыўным выглядзе. Памкненне да захавання роднай культуры і беражлівыя адносіны да яе надаюць сілы моладзі ў здольнасці імправізаваць, абапіраючыся на свой жыццёвы вопыт.

Этап генеральнага прагона накіраваны на стварэнне, замацаванне і ўдакладненне святочнай атмасферы абрада, дынамічнага тэмпа-рытма дзеяння і дзеянняў кожнага ўдзельніка.

На працягу асабістай шасцігадовай педагагічнай работы аўтара склаліся ўмоўныя катэгорыя студэнтаў, якія можна падзяліць па ступені ўдзелу ў агульнай справе арганізацыі і правядзення абраду:

- студэнты-добраахвотнікі – садзейнічаюць арганізацыі і здзяйсненню абрада, актыўна шукаюць інфармацыю па абраду, праяўляюць добрыя здольнасці ў спевах, сістэматычна наведваюць рэпетыцыі, з’яўляюцца ініцыятарамі творчых знаходак у дзеяннях абраду;
- студэнты-тэарэтыкі – удзельнічаюць у напісанні сцэнарыя абраду, але праяўляюць пасрэдную актыўнасць у яго рэалізацыі, маюць звычку прапускаць заняткі;
- студэнты-самадастатковыя – добра паказваюць сябе на экзамене, прымаюць частковы ўдзел у напісанні сцэнарыя, дрэнна паводзяць сябе на рэпетыцыях, прапускаюць заняткі, але інтэнсіўна пачынаюць дапамагаць у арганізацыі абраду на апошніх этапах рэпетыцыйнага працэсу;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- студэнты-крытыкі – ставяць пад сумненне ўсе прапановы, якія датычацца сцэнарыя, могуць выступаць стваральнікамі негатыўнага настрою ў групе, але часта прапануюць новыя шляхі вырашэння спрэчных сітуацый у рэпетыцыях, наведваюць рэпетыцыі;

- студэнты-пасіў – студэнты несістэматычна наведваюць рэпетыцыі, ігнаруюць даручэнні выкладчыка ці ціха сядзяць на рэпетыцыях, вельмі пасрэдна прымаюць удзел у агульнай справе па арганізацыі абраду, імкнуцца адцягнуць увагу ўсёй групы ці часткі студэнтаў на іншыя праблемы;

- студэнты-арганізатары – дрэнна наведваюць рэпетыцыі, але праяўляюць зацікаўленасць у падрыхтоўцы мастацка-дэкаратыўнага афармлення памяшкання, дзе будзе адбывацца абрад, прыносяць рэдкія рэчы, рэквізіт, касцюмы і інш.

На падставе прадстаўленага матэрыялу можна выказаць метадычныя парады для педагогаў, якія паставілі задачу ўвасобіць беларускі народны абрад:

- сістэматычна накіроўваць увагу студэнтаў да паступовага правядзення кожнага этапа рэпетыцый, складзці графік правядзення этапаў рэпетыцый і кантраляваць іх выкананне;

- калі большасць студэнцкай групы праяўляе сябе як пасіў, то выкладчыку неабходна скіроўваць дзеянні на выяўленне студэнтаў-арганізатараў і актывізаваць іх творчыя магчымасці для збора ўвагі ўсёй групы;

- падтрымліваць і рабіць прыкладам для групы студэнтаў-добраахвотнікаў, якія сваім запалам дапамогуць зацікавіць усю групу арганізацыяй агульнага абраду.

*Спіс літаратуры*

1. Гротовский, Е. Театр и ритуал / Е. Гротовский // От Бедного Театра к Искусству-проводнику: сб. ст. – Москва, 2003. – С. 100–120.

*Author has considered methodic of organization of belorussian rite in premises. Rite is regard as an examination in the discipline of «Direction of holydays». Stages of organization of rite is consisted of a «ontable» period (choice of rites, writing of scenario, reading of text on roles), rehearsals of episodes (crowd scenes), dress rehearsal. Different categories of students are defined on the principal of participation in general cause (volunteers, theorists, critics, self-confidents, passive, organizers). Recommendation can be applied for improvement of quality of psychological and pedagogical relations in student's group.*

***В.Л. Гуцько,** кандыдат культуралогіі, дацэнт БДУКіМ (г. Мінск).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 379.843

**И.В. Филипович, П.Ю. Булатый**

## РАЗВИТИЕ НОСТАЛЬГИЧЕСКОГО ТУРИЗМА В г. ЛЯХОВИЧИ
### (в рамках туристического проекта «По дорогам литвинского Предполесья»)

*Рассматривается возможность развития регионального ностальгического туризма для иммигрантов из Беларуси. Основой для осуществления туров являют-*